УДК 94(476)“1863/1897”

# КАНТРЫБУЦЫЙНЫ ЗБОР У РУСІФІКАТАРСКАЙ ПАЛІТЫЦЫ РАСІЙСКАГА ЎРАДА Ў ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНІМ КРАІ (1863–1897 гг.)[1]

**А. П. Жытко,**
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-4750-1772;*

**С. А.Талмачова,**
*доктар гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6708-0282*

Паступіў у рэдакцыю 11.10.2024.

UDC 94(476)“1863/1897”

# CONTRIBUTION FEE IN THE RUSSIFICATION POLICY OF THE RUSSIAN GOVERNMENT IN THE NORTH-WESTERN REGION (1863–1897)

**A. Zhitko,**
*Doctor of History, Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Peoples, Belarusian state pedagogical university named after Maxim Tank*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-4750-1772;*

**S. Tolmacheva,**
*Doctor of History, Head of the Department of History of Belarus and Slavic Peoples, Belarusian state pedagogical university named after Maxim Tank*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6708-0282*

Received on 11.10.2024.

Асноўнай рухаючай сілай паўстання 1863–1864 гг. у Царстве Польскім і Заходнім краі з’яўлялася шляхта рымска-каталіцкага веравызнання, якую падтрымлівалі памесныя дваране-католікі і каталіцкая царква. Галоўным механізмам рэалізацыі палітыкі русіфікацыі Заходняга края з’явіўся кантрыбуцыйны збор з даходаў маёнткаў католікаў і іх нерухомай маёмасці ў гарадах. Гэты «падатак» даваў магчымасць рускім пакупнікам па льготным кошце набываць памесці ў заходніх губернях, павышаць жалаванне рускім чыноўнікам, матэрыяльна падтрымліваць праваслаўнае духавенства і настаўніцтва.

*Ключавыя словы:* Беларусь, Паўночна-Заходні край, кантрыбуцыйны збор, русіфікатарская палітыка, дваранства, памешчыкі рымска-каталіцкага веравызнання.

The main driving force of the uprising of 1863-1864 in the Kingdom of Poland and the Western Region was the nobility of the Roman Catholic faith, which was supported by local Catholic nobles and the Catholic Church. The main mechanism for implementing the Russification policy of the North-Western Region was the contribution fee from the income of Catholic estates and their real estate in cities. Russian Russian buyers could purchase estates in the western provinces at a discounted price, raise the salaries of Russian officials, and financially support the Orthodox clergy and teachers.

*Keywords:* Belarus, North-Western Region, indemnity fee, Russification policy, nobility, landowners of the Roman Catholic faith.

*Уводзіны.* Рэформа 19 лютага 1861 г. знаменавала сабой карэнны пералом у сацыяльна-эканамічных адносінах. Яна з’явілася базавай у пераходзе расійскага грамадства ад стабільнага (аграрнага) да індустрыяльнага грамадства. Мадэрнізацыя ахапіла ўсе сферы жыццядзейнасці Расійскай дзяржавы. Пачалася эпоха Вялікіх рэформ. Разам з тым, мадэрнізацыйныя працэсы пацягнулі за сабой і праблему вырашэння «польскага пытання», чаму паспрыяла паўстанне 1863–1864 гг. не толькі ў Царстве Польскім, але і ў Заходнім краі[2]. Для захавання непадзельнасці імперыі паўстанне было падаўлена ўзброенай сілай. Яго асноўнай рухаючай сілай з’яўлялася дробная шляхта рымска-каталіцкага веравызнання, якую падтрымлівалі памесныя дваране-католікі і каталіцкая царква. Каб не дапусціць

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках выканання задання «Деятельность органов государственного управления по реализации социально-экономической политики в белорусской деревне (1861–1914 гг.)» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Общество и гуманитарная безопасность белорусского государства» на 2021–2025 гг. № ГР 20211358.

[2] Заходні край – тэрыторыя, далучаная да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай у 1772, 1793 і 1795 г. Адміністрацыйна Заходні край падзяляўся на Паўднёва-Заходні, які ўключаў Валынскую, Кіеўскую і Падольскую губерні, і Паўночна-Заходні ў складзе Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Ковенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў.

актыўны сепаратызм у перспектыве, расійскі ўрад пайшоў на падрыў эканамічнага патэнцыялу асобаў польскага паходжання ў 9 заходніх губернях. Адным з інструментаў гэтай палітыкі з'явілася ўвядзенне кантрыбуцыйнага збору з маёнткаў памешчыкаў-католікаў. Разам з тым, праблема працэнтнага збору ў рэчышчы русіфікатарскай палітыкі ў Заходнім краі не стала прадметам спецыяльнага вывучэння ў беларускай гістарычнай навуцы, за выключэннем асобных яе аспектаў. Так, С. М. Самбук раскрыла палітыку самадзяржаўя ў Беларусі ў другой палове XIX ст., у тым ліку ў дачыненні да вышэйшага саслоўя края [1]. С. А. Талмачова выявіла механізм спагнання працэнтнага збору [2]. А. П. Жытко раскрыў уплыў кантрыбуцыйных збораў на стан дваранскай памешчыцкай гаспадаркі [3]. Неабходна вызначыць і манаграфію расійскай даследчыцы Г. А. Камзолавай, у якой раскрыта барацьба ў асяроддзі вышэйшай бюракратыі вакол праблемы працэнтнага збору [4].

*Асноўная частка.* З 1861 г. у Расійскай імперыі пачалася эпоха Вялікіх рэформ, галоўнай з якіх з'явілася скасаванне прыгоннага ладу, што паклала пачатак маштабнай мадэрнізацыі сацыяльна-эканамічных і палітычных адносін у дзяржаве. Аднак пераўтварэнні, якія адбываліся ў перыяд кіравання Аляксандра II, выявілі і пэўную няўстойлівасць дзяржаўнай улады. Адной з праяў унутранай нестабільнасці стала паўстанне 1863–1864 гг., якое ахапіла не толькі Царства Польскае, але і Заходні край. Паўстанне паставіла на парадак дня пытанне аб адзінстве і непадзельнасці Расійскай імперыі і вымусіла самадзяржаўе адмовіцца ад палітыкі «прымірэння» з палякамі. Змена ўрадавага курса прадугледжвала татальную русіфікацыю заходніх губерняў, што выклікала перагляд палітыкі ў бок інтарэсаў сялянства і эканамічнага падрыву польскага меснага дваранства.

Новы Віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў бачыў два шляхі барацьбы з паўстаннем: «Поляка надобно смирить страхом и копейкою» [5, с. 259]. Сістэма русіфікацыі Паўночна-Заходняга краю, створаная М. М. Мараўёвым, складалася з наступных структурных элементаў: стварэнне неспрыяльных умоў для гаспадарчай дзейнасці памешчыкаў-католікаў; пераўтварэнне сялян розных веравызнанняў у сацыяльную апору самадзяржаўя ў краі; насаджэнне рускага землеўладання; татальная замена чыноўнікаў-католікаў рускімі; падтрымка праваслаўнай царквы і мінімізацыя ўплыву на насельніцтва каталіцкага касцёла; развіццё рускай пачатковай адукацыі.

Для рэалізацыі гэтай маштабнай праграмы неабходны былі велізарныя фінансавыя сродкі. Адным з спосабаў вырашэння дадзенай праблемы сталі канфіскацыі і секвестр маёнткаў і маёмасці не толькі ўдзельнікаў паўстання і іх памагатых, але і тых, хто ў той ці іншай ступені спачуваў паўстанню. Аднак у прадстаўленні міністру ўнутраных спраў П. А. Валуеву 26 мая 1863 г. Мураўёў адзначаў, што «наложение секвестра на имения лишь явно уличенных в сочувствии мятежу помещиков оказывается при настоящих обстоятельствах неудобоисполнимо, по неимению у правительства достаточных средств для учреждения казённой администрации в весьма значительном количестве имений» [6, арк. 15 адв.]. У сувязі з гэтым ён прапанаваў усіх без выключэння ўласнікаў (без сялян) прыдатных зямель абкласці часовым 10 % грашовым зборам для пакрыцця выдаткаў урада на падаўленне паўстання. Заходні камітэт на пасяджэнні 4 чэрвеня 1863 г. адобрыў дадзеную прапанову, аргументуючы тым, што дваранства заходніх губерняў вінавата калі не ў прамым удзеле ў паўстанні, то ў бяздзеянні [6, арк. 15 адв.]. 8 чэрвеня 1863 г. Аляксандр II зацвердзіў палажэнне камітэта [6, арк. 1 адв.].

Пазямельны збор выплочваўся штогод з колькасці прыдатнай зямлі і прыблізнага з яе прыбытку па кожным маёнтку. Памешчыкі-ўладальнікі нерухомай маёмасці ў гарадах абкладаліся дадатковым 1 % зборам з капітальнай вартасці іх гарадскіх дамоў. «Узмоцнены» 20–30 % збор распаўсюджваўся на маёнткі непасрэдных удзельнікаў паўстання. Паместныя дваране рускага і остзейскага паходжання першапачаткова былі абкладзены 5 % зборам, але неўзабаве яго памер быў паменшаны да 2,5–1,5 % [7, с. 294–302]. У 1863 г. кантрыбуцыйны збор з усіх памешчыцкіх маёнткаў Паўночна-Заходняга края склаў амаль 2,6 млн руб. [8, с. 88].

Увесну 1864 г., калі паўстанне пайшло на спад, Мураўёў прапанаваў паменшыць 10-працэнтны збор да 5-працэнтнага. Разам з тым, ён лічыў несвоечасовым поўнае скасаванне гэтага падатку, таму што для абрусення края неабходны былі значныя выдаткі. Па яго разліках, часовы працэнтны збор у шасці паўночна-заходніх губернях у 1864 г. павінен скласці 1,1–1,2 млн руб., чаго было недастаткова для падтрымкі праваслаўнай царквы, народных школ, павелічэння жалавання рускім чыноўнікам і інш. Прапановы Мураўёва былі ўхвалены Заходнім камітэтам і 7 красавіка 1864 г. зацверджаны імператарам [9, арк. 212, 217–222].

М. М. Мураўёў лічыў, што матэрыяльнае пакаранне павінны несці ўсе слаі насельніцтва, вінаватыя ў падтрымцы паўстання. У сувязі з гэтым у ліпені 1863 г. ён выдаў распараджэнне аб адначасовым кантрыбуцыйным зборы

ў памеры 10–25 руб. з кожнага двара тых шляхецкіх ваколіц і аднадворцаў, на тэрыторыі якіх адбываліся сутычкі войск з атрадамі паўстанцаў. Акрамя гэтага, улетку і ўвосень 1863 г. у памешчыкаў-католікаў і шляхты канфіскоўваліся коні, фураж, павозкі і збожжа. Гэты дадатковы кантрыбуцыйны збор склаў прыблізна яшчэ 800 тыс. руб. [3, с. 77].

Працэнтны збор, хаця і быў зацверджаны Аляксандрам II, пры Мураўёве фактычна знаходзіўся ў распараджэнні віленскай адміністрацыі і расходаваўся па яе меркаванні. Нават міністр унутраных спраў і шэф жандараў дакладна не ведалі аб суме збору, атрыманай у 1864 г. Фінансавая самастойнасць і непадкантрольнасць Віленскага генерал-губернатара выклікалі незадавальненне афіцыйнага Пецярбурга і правакавалі абвінавачванні аб фінансавых махінацыях чыноўнікаў віленскай адміністрацыі [10, арк. 3 адв.].

М. М. Мураўёў у сваёй апошняй справаздачы аб кіраванні Паўночна-Заходнім краем указваў, што працэнтны ці кантрыбуцыйны збор з польскіх памешчыкаў павінен быць пастаянным [3, с. 174; 11, с. 510]. Яго пераемнік на пасадзе Віленскага генерал-губернатара фон К. П. Каўфман у 1866 г. заяўляў аб неабходнасці захавання кантрыбуцыйнага збору нават пасля скасавання ваеннага становішча, таму што гэты збор – не карная мера, а дапамога дзяржаўнай казне ў пакрыцці вялікіх выдаткаў для канчатковага ўладкавання края [12, арк. 122–122 адв.].

Увядзенне працэнтнага збору было выклікана не толькі фінансавымі праблемамі, звязанымі з марнаваннем значных сродкаў у ходзе русіфікацыі края. У вышэйшых эшалонах улады «руская партыя» (часовае аб'яднанне прадстаўнікоў вышэйшай бюракратыі, якая фарміравалася ў працэсе падрыхтоўкі, абмеркавання і прыняцця законапраектаў, што тычыліся ўскраін Расійскай імперыі, у тым ліку і Заходняга края), ядро якой у 60-х гг. XIX ст. складалі М. М. Мураўёў, К. П. Каўфман, браты М. А. і Д. А. Мілюціны, А. А. Зялёны, вяла барацьбу з «партыяй касмапалітаў». Ключавую ролю ў ёй адыгрывалі міністр унутраных спраў П. А. Валуеў і шэф жандараў В. А. Даўгарукаў. Адной з важнейшых праблем у рэалізацыі палітыкі русіфікацыі Заходняга краю з'яўляліся спосабы насаджэння тут рускага і памяншэння польскага землеўладання. «Партыя» П. А. Валуева і яе прыхільнікі лічылі, што ў аснове трываласці дзяржаўнай улады ў Расійскай імперыі, як і ва ўсім цывілізаваным свеце, ляжыць непахіснасць прыватнай уласнасці, у тым ліку і на зямлю. Яны не былі супраць канфіскацый і секвестру нерухомай маёмасці ўдзельнікаў паўстання і іх памагатых. Пры гэтым прадстаўнікі дадзенага аб'яднання выступалі супраць прыняцця дыскрымінацыйных заканадаўчых актаў у дачыненні да землеўладання памесных дваран-католікаў.

«Руская партыя» прытрымлівалася іншых поглядаў і была ініцыятарам прыняцця закона 10 снежня 1865 г., у адпаведнасці з якім католікам, акрамя сялян, забаранялася набываць землі ў заходніх губернях, не інакш як толькі па спадчыне. Некаторыя прадстаўнікі гэтай «партыі» нават прапаноўвалі перасяліць польскіх землеўласнікаў з Заходняга края ў Царства Польскае, а іх землі прадаць рускім памешчыкам. У сувязі з гэтым П. А. Валуеў пісаў: «Мне нестерпимо то хладнокровие, с которым они тасуют людей, верования, правила, как карты, которые можно изорвать и бросить под стол… Они думают выгнать 10 тыс. семейств…» [3, с. 196]. У 1862 г. у пяці беларускіх губернях налічвалася каля 10 тыс. памесных дваран, якія валодалі землямі ў памеры ад 100 і больш дзесяцін. З іх 93,3 % былі католікамі [3, с. 80]. У гэтай сувязі важнае месца ва ўрадавай палітыцы займаў працэнтны збор з польскіх маёнткаў, які даваў магчымасць віленскай адміністрацыі не толькі фінансава падтрымліваць рускія народныя школы, праваслаўную царкву, павышаць аклады чыноўнікам рускага паходжання, інакш кажучы, праводзіць палітыку русіфікацыі на практыцы, але і ўплываць на пазямельныя мабілізацыйныя працэсы ў цэлым. Урад разлічваў, што фінансавы прэс у выглядзе кантрыбуцыйнага збору прывядзе да масавага распродажу католікамі сваіх маёнткаў. У журнале Асобай камісіі, якая абмяркоўвала праект закона 10 снежня 1865 г., было запісана, што «непримиримо враждебные России люди решатся покинуть Западный край и заменятся русскими помещиками, а прочие поляки, способные помириться с полным, бесповоротным владычеством России, сделаются спокойными гражданами» [12, арк. 69]. Неабходна адзначыць, што да сакавіка 1867 г. грашовымі сродкамі з працэнтнага збору генерал-губернатары Паўночна- і Паўднёва-Заходняга краю распараджаліся асабіста і бескантрольна. Толькі з 1867 г. сумы з працэнтнага збору пачалі прылічацца да агульных дзяржаўных прыбыткаў. Гэта значыць, што ўсе выдаткі на мерапрыемствы ўрада па русіфікацыі Заходняга края з 1867 г. пачалі выдаткоўвацца з дзяржаўнага казначэйства і тым самым былі выключаны з распараджэння генерал-губернатарскага ўпраўлення [14, арк. 13–15].

Упершыню пытанне аб скарачэнні працэнтнага збору было ўзнята ў сферы вышэйшай бюракратыі ў канцы 1867 г. па ініцыятыве новага Віленскага генерал-губернатара Э. Т. Бара-

нава. Міністр унутраных спраў П. А. Валуеў пісаў, што «систематическое разорение во имя правительства сотен и даже тысяч семейств противоречило характеру графа Баранова» [13, с. 434, Примеч. 136]. Для разгляду гэтага пытання цар 1 студзеня 1868 г. адобрыў стварэнне спецыяльнай камісіі на чале з князем А. М. Дандуковым-Корсакавым, у склад якой увайшлі чыноўнікі міністэрстваў фінансаў і ўнутраных спраў, Дзяржаўнага кантролю, канцылярый генерал-губернатараў Паўночна- і Паўднёва-Заходняга края. У снежні 1868 г. камісія закончыла сваю працу, вынікі якой былі даложаны міністру фінансаў М. Х. Рэйтэрну. На 1870 г. памер працэнтнага збору для 9 губерняў быў вызначаны ў памеры 2 450 тыс. руб. (для 6 паўночна-заходніх губерняў – 1 205 тыс. руб.). На працягу першых 11 гадоў гэта сума павінна была скараціцца да 1600 тыс. руб. за кошт памяншэння выплаты 50-ці працэнтнай надбаўкі да жалавання рускім чыноўнікам і колькасці асабовага складу жандарскіх упраўленняў у Заходнім краі. Акрамя гэтага, камісія выпрацавала правілы раскладкі збору. Валавая сума збору ў 2 450 тыс. руб. была прапарцыянальна размеркавана па кожнай з 9 губерняў, выходзячы з колькасці дзесяцін прыдатнай зямлі. У выніку максімальная сума збору з дзесяціны зямлі ў Ковенскай губ. склала 27,7 кап. (агульная сума – 361 тыс. руб.), а мінімальная – для Магілёўскай і Мінскай – па 9,2 кап. (агульны збор – адпаведна 100 тыс. руб. і 217 тыс. руб.). Заключэнне камісіі князя А. М. Дандукова-Корсакава разглядалася ў Камітэце міністраў 18, 25 лютага і 4 сакавіка 1869 г., які з невялікімі праўкамі адобрыў прапановы камісіі. Журнал Камітэта міністраў быў падпісаны Аляксандрам II 3 сакавіка 1869 г. [14, арк. 36].

Такім чынам, раскладка працэнтнага збору, яго памер і спосабы спагнання атрымалі канкрэтную акрэсленасць. Аднак на месцах, асабліва ў павятовых раскладачных камісіях, наглядаліся розныя падыходы для высвятлення даходнасці маёнткаў. Прызначаная на губерню сума размяркоўвалася на кожнае трохгоддзе на аб'яднаным пасяджэнні губернскай па сялянскіх справах прысутнасці і асобай аб земскіх павіннасцях прысутнасці, якія ўстанаўлівалі памер збору па кожным павеце. У паветах канкрэтным вызначэннем памеру збору для кожнага маёнтка займаліся спецыяльныя раскладачныя камісіі. У склад камісіі ўваходзілі павятовы прадвадзіцель дваранства (старшыня), спраўнік, два міравыя пасрэднікі і 4 прадстаўнікі ад памешчыкаў, на маёнткі якіх распаўсюджваліся зборы. Кандыдатаў у камісію ад землеўласнікаў адбіраў губернскі прадвадзіцель дваранства, з ліку якіх чатырох зацвярджаў губернатар. Сума збору, прызначаная для ўсяго павета, размяркоўвалася паміж землеўласнікамі. Пры гэтым улічвалася сукупнасць паказчыкаў: плошча прыдатнай зямлі, яе каштоўнасць, лясныя ўгоддзі, наяўнасць прамысловых прадпрыемстваў і інш. На гэтай падставе ўстанаўлівалася прыблізная прыбытковасць маёнтка. Разам з тым, не толькі ў губернскіх прысутнасцях, але і ў павятовых камісіях не існавала аднастайнай методыкі вылічэння прыбытковасці маёнткаў, што нярэдка прыводзіла да злоўжыванняў з боку чыноўнікаў і скаргаў памешчыкаў у вышэйшыя ўстановы [2, с. 9–10].

Пры памяншэнні аклада з пэўнага маёнтка адпаведная сума раўнамерна размяркоўвалася паміж астатнімі таго ж павета. У выпадку пераходу зямлі ва ўласнасць рускім памешчыкам збор з іх выключаўся з сумы, прызначанай на павет, з наступнага пасля такога пераходу года [2, с. 8].

З прызначэннем 2 сакавіка 1868 г. на пасаду Віленскага генерал-губернатара А. Л. Патапава, прадстаўніка «партыі касмапалітаў», сучаснікі справядліва звязвалі паварот ва ўрадавай палітыцы ў Паўночна-Заходнім краі. Па словах К. Ф. Галавіна, у Вільні А. Л. Патапаў «круто повернул в сторону от муравьёвской политики… и задумал искать примирения с поляками» [15, с. 99]. Крокі да гэтага прымірэння былі асцярожнымі. У першую чаргу новы генерал-губернатар выступаў за адмену многіх надзвычайных мер, якія падрывалі эканамічнае становішча памеснага каталіцкага дваранства, непарушнасць асабістай зямельнай уласнасці.

У выніку рэалізацыі закона ад 10 снежня 1865 г. паступова скарачалася колькасць маёнткаў памешчыкаў-католікаў і пры гэтым павялічвалася рускае землеўладанне ў краі. Нягледзячы на гэта, сумы працэнтнага збору з губерняў не мяняліся, яны дадаткова размяркоўваліся паміж застаўшыміся каталіцкімі памесцямі. На гэту з'яву звярнуў увагу А. Л. Патапаў. У запісцы на імя цара ад 15 красавіка 1870 г. ён указваў на абцяжаранасць маёнткаў працэнтным зборам. Аляксандр II даручыў абмеркаваць гэта пытанне на нарадзе міністраў фінансаў М. Х. Рэйтэрна, унутраных спраў А. Я. Цімашава, шэфа жандараў П. А. Шувалава і А. Л. Патапава. Нарада адбылася 28 красавіка 1870 г. Было прапанавана наогул адмовіцца ад спагнання гэтага збору з 1 студзеня 1871 г., а ўсе выдаткі, якія пакрываліся з працэнтнага збору, падзяліць на агульнадзяржаўныя і мясцовыя. Агульнадзяржаўныя павінны былі фінансавацца з казначэйства, а для пакрыцця мясцовых патрэбаў меркавалася ўвесці падатак, які раўнамерна размяркоўваўся паміж землеўласнікамі ўсіх саслоўяў Заходняга края. Такім чынам, новы падатак, які замяніў

бы працэнтны збор з памешчыкаў-католікаў, распаўсюджваўся на ўсіх прыватных землеўласнікаў, у тым ліку і на рускіх памешчыкаў і мясцовых сялян [3, с. 292]. Гэта значыць, што такі падатак мог стаць правобразам земскага падатку ў губернях з земскім самакіраваннем. Журнал гэтай нарады 5 мая 1870 г. быў прадстаўлены шэфам жандараў П. А. Шувалавым Аляксандру II, які даручыў Камітэту міністраў абмеркаваць дадзенае пытанне. Аднак гэтага не адбылося. Неўзабаве Шувалаў атрымаў дазвол правесці яшчэ адну нараду па гэтай справе ў тым жа складзе, але з удзелам новага генерал-губернатара Паўднёва-Заходняга края А. М. Дандукова-Корсакава. У ходзе другой нарады былі ўнесены значныя змены ў варыянт заключэння першага абмеркавання. Даклад з заключэннямі другой нарады быў прадстаўлены імператару міністрам унутраных спраў А. Я. Цімашавым і зацверджаны 31 снежня 1870 г. [16, с. 631–632].

У гэтым дакуменце размова ішла аб захаванні працэнтнага збору як меры вымушанай, да таго часу, пакуль у 9 заходніх губернях 2/3 плошчы памешчыцкай зямлі пяройдзе ў рукі асобаў рускага паходжання, а лік апошніх дасягне не менш паловы ўсіх уладальнікаў маёнткаў у губернях. Але пры гэтым была ўлічана прапанова А. Л. Патапава, таму што з 1870 г. для 6 паўночна-заходніх губерняў працэнтны збор быў паменшаны на палову. Так, у 1890 г. памешчыкі-католікі Віленскай губ. павінны былі заплаціць 88,8 тыс. руб., ці на 56,6 % менш, чым у 1871 г. [2, с. 9]. Акрамя гэтага, з 1 студзеня 1871 г. скасоўваўся 1 % збор з гарадской нерухомай маёмасці асобаў польскага паходжання[1] [17, арк. 20–23, 108–119, 139–144].

Рэалізацыя ўказаў 3 сакавіка 1869 г. і 31 снежня 1870 г. паставіла на парадак дня праблему скарачэння колькасці чыноўнікаў і працэнтных надбавак да іх жалавання. Так, у 1869 г. колькасць жандарскіх упраўленняў у паўночна-заходніх губернях скарацілася з 50 да 28, а іх асабовы склад быў паменшаны на 22 штаб-афіцэры і 412 ніжніх чыноў [18, арк. 12–15].

Да 1869 г. 50 % надбаўкі да жалавання атрымлівалі ўсе чыноўнікі праваслаўнага веравызнання. З гэтага ж года надбаўкі распаўсюджваліся толькі на тых чыноўнікаў, якія атрымлівалі жалаванне з дзяржаўнага казначэйства. Служачыя дваранскіх апек, сіроцкіх судоў, гарадскіх дум, статыстычных камітэтаў і іншых устаноў былі пазбаўлены гэтага права [19, арк. 1–2].

Па законе ад 13 чэрвеня 1886 г. аб перавагах службы ў Заходнім краі надбаўкі да жалавання прызначаліся толькі чыноўнікам рускага немясцовага паходжання [20, арк. 16; 21, с. 347–357]. У 1902 г. кантынгент служачых у заходніх губернях быў яшчэ больш звужаны. Надбаўкі ў памеры 50 % маглі атрымліваць толькі асобы рускага паходжання, якія займалі класныя пасады ў канцылярыях духоўных кансісторый Рускай Праваслаўнай Царквы, канцылярыях губернатараў, у гарадскіх і павятовых паліцэйскіх установах, а таксама настаўнікі царкоўна-прыходскіх школ. Другую групу складалі чыноўнікі ад 14 да 8 класа з надбаўкамі да жалавання ў 20 % [3, с. 215].

Указ 31 снежня 1870 г. не задаволіў поўнасцю А. Л. Патапава. Ён пачаў шукаць новыя шляхі для скарачэння працэнтнага збору. У сваёй справаздачы па кіраванні краем за 1868–1870 гг. ён хадайнічаў перад імператарам аб вызваленні ад уплаты дадзенага збору асобаў польскага паходжання, якія знаходзіліся на дзяржаўнай і вайсковай службе ва ўсёй імперыі ці атрымалі казённыя пенсіі за ўдзел у войнах. Аднак па ўказе ад 30 сакавіка 1873 г. ад уплаты працэнтнага збору вызваляліся толькі ваеннаслужачыя і параненыя на вайсковай службе [14, арк. 59, 61, 65]. У лістападзе 1873 г. А. Л. Патапаў зноў паспрабаваў дабіцца вызвалення ад збору чыноўнікаў-католікаў дзяржаўных устаноў. Але шэф жандараў П. А. Шувалаў заявіў аб немэтазгоднасці падтрымаць гэта пытанне, таму што «лица эти принадлежат к классу мелкого дворянства и так называемой шляхты, благонадёжность коих более чем сомнительна» [14, арк. 36–37].

22 ліпеня 1874 г. А. Л. Патапаў быў прызначаны начальнікам III Аддзялення – шэфам жандараў, а яго месца на пасадзе Віленскага генерал-губернатара заняў П. П. Альбядзінскі. Яны сумесна на працягу 1874–1876 гг. неаднаразова ўздымалі пытанне аб канчатковым скасаванні працэнтнага збору, але іх прапановы пацярпелі няўдачу [3, с. 294–296].

Усходні крызіс і руска-турэцкая вайна 1877–1878 гг. адхілілі праблему працэнтнага збору ў заходніх губернях на задні план. У запісцы на імя імператара ад 7 снежня 1879 г. П. П. Альбядзінскі разам з іншымі узняў пытанне наконт скасавання працэнтнага збору. Разгляд гэтай прапановы быў перададзены ў Камітэт міністраў. Пасяджэнні адбыліся 20 мая і 3 чэрвеня 1880 г. У выніку Камітэт міністраў канстатаваў, што працэнтны збор напрамую звязаны з поспехамі ўкаранення рускага землеўладання ў Заходнім краі. Таму

[1] З 1865 па 1902 г. у юрыдычнай практыцы пад паняццем «асоба польскага паходжання» разумеліся не ўсе католікі 9 заходніх губерняў, а толькі памешчыкі рымска-каталіцкага веравызнання, хаця мясцовая адміністрацыя да гэтай групы насельніцтва далучала і прадстаўнікоў і ншых саслоўных груп.

гэта праблема мае не столькі эканамічны, колькі палітычны характар. Тым больш, што задачы, зафіксаваныя ва ўказе ад 31 снежня 1870 г., не былі вырашаны. Такім чынам, ліквідацыя працэнтнага збору з маёнткаў памешчыкаў-католікаў Паўночна-Заходняга края была адтэрмінавана на няпэўны час [22, арк. 1 адв.]. Нягледзячы на гэта, з канца 1860-х гг. і да пачатку 1880-х гг. па хадайніцтвах віленскіх генерал-губернатараў А. Л. Патапава і П. П. Альбядзінскага шэраг буйных землеўласнікаў-католікаў царскай міласцю былі вызвалены ад дзеяння закона 10 снежня 1865 г. і адпаведна ад выплаты працэнтнага збору. Толькі ў Віленскай і Гродзенскай губернях налічвалася 118 такіх памешчыкаў [1, с. 71]. У сувязі з гэтым часта здаралася тое, што паявтовыя раскладачныя камісіі своечасова не выключалі вызваленыя ад збору маёнткі са спісаў і не памяншалі суму збораў з каштарысаў. У такім выпадку гэты памер кантрыбуцыі пераносіўся на наступнае трохгоддзе і спаганяўся з іншых памешчыкаў, што прыводзіла «к несправедливому обременению плательщиков» [2, с. 12].

Нягледзячы на паступовае скарачэнне колькасці землеўладанняў, абкладзеных кантрыбуцыйным зборам, паступленні ў казну былі значнымі. Так, у 1885 г. гэты збор у 5 беларускіх губернях склаў 411 тыс. руб., што перавышала пазямельны падатак з усіх прыватных землеўласнікаў на 220 тыс. руб. У 1896 г. працэнтны збор знізіўся да 294 тыс. руб., аднак ён пераўзыходзіў пазямельны падатак на 157 тыс. руб. [23].

Дзякуючы кантрыбуцыйнаму збору, урад здолеў запоўніць службовыя пасады ва ўсіх дзяржаўных установах асобамі рускага паходжання, за выключэннем 70-х гг. XIX ст. Пры гэтым значную ролю ў гэтым працэсе адыграла Палажэнне Заходняга камітэта, адобранае імператарам 22 мая 1864 г., у адпаведнасці з якім усе вышэйшыя службовыя пасады, цесна звязаныя з народам (сялянствам), замяшчаліся толькі рускімі чыноўнікамі [24, арк. 87–90 адв.].

Значныя сродкі з працэнтнага збору выдаткоўваліся на падтрымку праваслаўнага святарства і ў цэлым пазіцыі Рускай Праваслаўнай Царквы ў Заходнім краі. Мэце русіфікацыі заходніх губерняў служыла развіццё дзяржаўных народных і царкоўна-прыходскіх школ, забарона выкладання на польскай мове і ўжывання яе ў справаводстве і судзе.

Разам з тым, дамагчыся стварыць сацыяльна-эканамічны падмурак праз павелічэнне рускага землеўладання да 66 % і колькасці землеўладальнікаў няпольскага паходжання – да 50 % у 9 заходніх губернях, у тым ліку і беларускіх, урад не здолеў да пачатку XX ст.

Аб гэтым красамоўна сведчаць статыстычныя даныя. У 1862 г. у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях пражывала 9929 дваран-памешчыкаў, якія валодалі населенымі сялянамі землямі. 9261 чал. (93,3 %) з'яўляліся дваранамі-католікамі. Найбольшая ўдзельная вага памесных дваран-некатолікаў была ў Віцебскай губ. (12,6 %), а найменшая – у Мінскай (1,9 %) [25, арк. 96–97]. Нягледзячы на прымаемыя ўрадам меры па насаджэнні рускага землеўладання, нават у 1904 г. колькасць дваран-землеўласнікаў каталіцкага веравызнання ва ўсіх 5 беларускіх губернях заставалася дамінуючай. Так, у Віленскай губ. яны складалі 86,3 %, Гродзенскай – 80,3, Віцебскай – 67,0, Мінскай – 63,1 і ў Магілёўскай – 53,2 %. Аднак у руках некатолікаў у разліку на аднаго землеўладальніка зямлі стала больш, чым у асобаў польскага паходжання. У Магілёўскай губ. праваслаўныя, лютэране і магаметане сканцэнтравалі ў сваіх руках 756 857 дзес. зямлі, ці 53,5 % усяго дваранскага землеўладання губерні. У Мінскай губ. ім належала 1 372 060 дзес. (45,8 %), Віцебскай – 493 562 дзес. (43,7%), Гродзенскай – 307 275 дзес. (37,4 %) і Віленскай губ. – 317 691 дзес., ці 23,2 % [3, с. 84–85; 26, арк. 65–66; 27, арк. 9, 11, 20]. Таму не выпадкова, што земскае самакіраванне з 1911 г. уводзілася толькі ў трох беларускіх губернях (Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай), дзе было больш моцным землеўладанне дваран праваслаўнага і іншага, некаталіцкага веравызнання.

Канчаткова працэнтны збор з маёнткаў памешчыкаў рымска-каталіцкага веравызнання быў скасаваны ў 1897 г. у адпаведнасці з указам Мікалая II ад 27 сакавіка 1897 г. [28, с. 143–144]. Ва ўказе адзначалася, што «стремясь к упрочению в Западном крае русской государственности, мы … признали за благо отменить установленный в 1863 году процентный сбор с имений лиц польского происхождения» [28, с. 143]. Гэта азначала, што ўрад прадпрыняў крок да збліжэння з памешчыкамі рымска-каталіцкага веравызнання Заходняга края.

*Заключэнне.* Генеральная лінія русіфікатарскай палітыкі расійскага ўрада ў Заходнім краі базіравалася на ідэі, што далучаная да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыя (з 1802 г. – 9 губерняў) з'яўлялася ісконна рускай. Але пры гэтым лідзіруючая роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёну належала польскаму дваранству. Сацыяльнай апорай урада ў працэсе русіфікацыі края і яго паспяховай інтэграцыі ў склад Расійскай імперыі з 1860-х гг. лічылася сялянства рознай канфесійнай прыналежнасці, а не мясцовае памеснае дваранства рымска-ката-

ліцкага веравызнання. Менавіта прадстаўнікі гэтага вышэйшага саслоўя прынялі актыўны ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг. Таму закладзеная М. М. Мураўёвым сістэма кіравання ў Віленскім генерал-губернатарстве ў 1863–1865 гг. была скіравана на эканамічны падрыў памешчыкаў польскага паходжання. Важная роля ў гэтым надавалася канфіскацыям і секвестру «польскіх» маёнткаў і насаджэнню рускага землеўладання. Галоўным механізмам рэалізацыі палітыкі русіфікацыі Заходняга края з'явіўся кантрыбуцыйны збор з даходаў маёнткаў католікаў і іх нерухомай маёмасці ў гарадах. Гэты «падатак» даваў магчымасць рускім пакупнікам па льготным кошце набываць памесці ў заходніх губернях, павышаць жалаванне рускім чыноўнікам, матэрыяльна падтрымліваць праваслаўнае духавенства і настаўніцтва. Разам з тым, галоўная задача, якая ўскладвалася на працэнтны збор, не была выканана. За выключэннем Магілёўскай губ., зямельная маёмасць дваран-католікаў пераўзыходзіла рускае ў астатніх 5 губернях Паўночна-Заходняга края.


### Літаратура і крыніцы

1. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С. М. Самбук ; ред. В. П. Панютич. – Минск : Наука и техника, 1980. – 224 с.
2. *Талмачова, С. А.* Дзейнасць губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей па спагнанні кантрыбуцыйнага збору з памешчыцкіх маёнткаў на тэрыторыі Беларусі (1863–1897 гг.) / С. А. Талмачова // Вес. Беларус. дзяж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2019. – № 4. – С. 6–12.
3. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. : манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.
4. *Комзолова, А. А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М. : Наука, 2005. – 383 с.
5. *Письма М. Н.* Муравьева к А. А. Зеленому / Сообщено Н. И. Шатиловым ; предис. и ред. В. И. Семевского // Голос минувшего. – 1913. – № 9. – С. 240–265.
6. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). – Фонд 1267. Воп. 1. Спр. 18.
7. Сборник распоряжений графа Михаила Николаевича Муравьева по усмирению польского мятежа в северо-западных губерниях 1863–1964 / сост. Н. Цылов. – Вильна : тип. А. К. Киркора и бр. Роммов, 1866. – [4], IV, 385 с.
8. *Мосолов, А. Н.* Виленские очерки. 1863–1865 гг. (Муравьевское время) / А. Н. Мосолов. – СПб. : Тип. А. С. Суворина, 1898. – 253, IV с.
9. РДГА. – Фонд 1267. Воп. 1. Спр. 26.
10. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей – ДАРФ). – Фонд 678. Воп. 1. Спр. 1133.
11. Всеподданнейший отчет графа М. Н. Муравьева по управлению Северо-Западным краем (с 1 мая 1863 г. по 17 апреля 1865 г. // Русская старина. – 1902. – № 6. – С. 487–510.
12. ДАРФ. – Фонд 109. 1 эксп. Оп. 38. Спр. 23, Ч. 23.
13. *Валуев, П. А.* Дневник П. А. Валуева, министра внутренних дел / ред., введ., биограф. очерк и коммент. проф. П. А. Зайончковского : в 2 т. – Т. 2 : 1865–1876. – М. : Изд. акад. наук СССР, 1961. – 422 с.
14. ДАРФ. – Фонд 109. 1 эксп. Воп. 43 : 1868 г. Спр. 122.
15. *Головин, К. Ф.* Мои воспоминания : в 2 т. / К. Ф. Головин. – Санкт-Петербург : тип. «Колокол», 1908–1910. – Т. 1 : (До 1881 г.). – VIII, 396 с.
16. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – Собр. 2-е : в 55 т. – Т. 45 (1870). – Отд. 2. – № 49091.
17. РДГА. – Фонд 1282. Воп. 2. Спр. 388.

### References

1. *Sambuk, S. M.* Politika carizma v Belorussii vo vtoroj polovine XIX veka / S. M. Sambuk ; red. V. P. Panyutich. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1980. – 224 s.
2. *Talmachova, S. A.* Dzejnasc' gubernskih pa syalyanskih spravah prysutnascej pa spagnanni kantrybucyjnaga zboru z pameshchyckih mayontkaў na terytoryi Belarusi (1863–1897 gg.) / S. A. Talmachova // Ves. Belarus. dzyazh. ped. un-ta. Ser. 2, Gistoryya. Filasofiya. Palitalogiya. Sacyyalogiya. Ekanomika. Kul'turalogiya. – 2019. – № 4. – S. 6–12.
3. *Zhytko, A. P.* Dvaranstva Belarusi peryyadu kapitalizmu. 1861–1914 gg. : managrafiya / A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2003. – 233 s.
4. *Komzolova, A. A.* Politika samoderzhaviya v Severo-Zapadnom krae v epohu Velikih reform / A. A. Komzolova. – M. : Nauka, 2005. – 383 s.
5. *Pis'ma M. N.* Murav'eva k A. A. Zelenomu / Soobshcheno N. I. Shatilovym ; predis. i red. V. I. Semevskogo // Golos minuvshego. – 1913. – № 9. – S. 240–265.
6. Rasijski dzyarzhaўny gistarychny arhiў (dalej – RDGA). – Fond 1267. Vop. 1. Spr. 18.
7. Sbornik rasporyazhenij grafa Mihaila Nikolaevicha Murav'eva po usmireniyu pol'skogo myatezha v severo-zapadnyh guberniyah 1863–1964 / sost. N. Cylov. – Vil'na : tip. A. K. Kirkora i br. Rommov, 1866. – [4], IV, 385 s.
8. *Mosolov, A. N.* Vilenskie ocherki. 1863–1865 gg. (Murav'evskoe vremya) / A. N. Mosolov. – SPb. : Tip. A. S. Suvorina, 1898. – 253, IV c.
9. RDGA. – Fond 1267. Vop. 1. Spr. 26.
10. Dzyarzhaўny arhiў Rasijskaj Federacyi (dalej – DARF). – Fond 678. Vop. 1. Spr. 1133.
11. Vsepoddannejshij otchet grafa M. N. Murav'eva po upravleniyu Severo-Zapadnym kraem (s 1 maya 1863 g. po 17 aprelya 1865 g. // Russkaya starina. – 1902. – № 6. – S. 487–510.
12. DARF. – Fond 109. 1 eksp. Op. 38. Spr. 23, Ch. 23.
13. *Valuev, P. A.* Dnevnik P. A. Valueva, ministra vnutrennih del / red., vved., biograf. ocherk i komment. prof. P. A. Zajonchkovskogo : v 2 t. – T. 2 : 1865–1876. – M. : Izd. akad. nauk SSSR, 1961. – 422 s.
14. DARF. – Fond 109. 1 eksp. Vop. 43 : 1868 g. Spr. 122.
15. *Golovin, K. F.* Moi vospominaniya : v 2 t. / K. F. Golovin. – Sankt-Peterburg : tip. «Kolokol», 1908–1910. – T. 1 : (Do 1881 g.). – VIII, 396 s.
16. Polnoe sobranie zakonov Rossijskoj imperii (dalej – PSZRI). – Sobr. 2-e : v 55 t. – T. 45 (1870). – Otd. 2. – № 49091.
17. RDGA. – Fond 1282. Vop. 2. Spr. 388.

18. ДАРФ. – Фонд 110. Воп. 2. Спр. 3550.
19. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 295. Воп. 1. Спр. 1982.
20. РДГА. – Фонд 1284. Воп. 190. Спр. 85.
21. ПСЗРИ. – Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 6 (1886).– № 3817.
22. Аддзел рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. – Фонд 600. Адз. зах. 617.
23. Падлічана па: Ежегодник Министерства финансов / под ред. А. Б. Бушена. – СПб. : Тип. ред. период. изд. М-ва финансов, 1888. – Вып. 17 : 1885 г. – С. 152; Ежегодник Министерства финансов / под ред. А. Б. Бушена. – СПб. : Тип. ред. период. изд. М-ва финансов, 1899. – Вып. 26 : 1896 г. – С. 87; Свод сведений о поступлении казенных, земских и общественных окладных сборов за 1895–1899 годы : по отчетам подат. инспекторов / М-во финансов, Департамент оклад. сборов ; сост. Стат. отд-нием. – СПб. : Тип. Кн. В. П. Мещерского, 1902. – С. 212–213.
24. РДГА. – Фонд 1267. Воп. 1. Спр. 27.
25. РДГА. – Фонд 1282. Воп. 1. Спр. 365.
26. РДГА. – Фонд 1276. Воп. 1. Спр. 106.
27. РДГА. – Фонд 1283. Воп. 1. Спр. 41.
28. ПСЗРИ. – Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 17 (1897). – № 13899.

18. DARF. – Fond 110. Vop. 2. Spr. 3550.
19. Nacyyanal'ny gistarychny arhiў Belarusi (NGAB). – Fond 295. Vop. 1. Spr. 1982.
20. RDGA. – Fond 1284. Vop. 190. Spr. 85.
21. PSZRI. – Sobr. 3-e : v 33 t. – T. 6 (1886).– № 3817.
22. Addzel rukapisaў Rasijskaj nacyyanal'naj bibliyateki. – Fond 600. Adz. zah. 617.
23. Padlichana pa: Ezhegodnik Ministerstva finansov / pod red. A. B. Bushena. – SPb. : Tip. red. period. izd. M-va finansov, 1888. – Vyp. 17 : 1885 g. – S. 152; Ezhegodnik Ministerstva finansov / pod red. A. B. Bushena. – SPb. : Tip. red. period. izd. M-va finansov, 1899. – Vyp. 26 : 1896 g. – S. 87; Svod svedenij o postuplenii kazennyh, zemskih i obshchestvennyh okladnyh sborov za 1895–1899 gody : po otchetam podat. inspektorov / M-vo finansov, Departament oklad. sborov ; sost. Stat. otd-niem. – SPb. : Tip. Kn. V. P. Meshcherskogo, 1902. – S. 212–213.
24. RDGA. – Fond 1267. Vop. 1. Spr. 27.
25. RDGA. – Fond 1282. Vop. 1. Spr. 365.
26. RDGA. – Fond 1276. Vop. 1. Spr. 106.
27. RDGA. – Fond 1283. Vop. 1. Spr. 41.
28. PSZRI. – Sobr. 3-e : v 33 t. – T. 17 (1897). – № 13899.

ВЦ БДПУ